Калацэй В. В.

# ЭКЗАТЭРЫЧНЫЯ І ЭЗАТЭРЫЧНЫЯ БАКІ КАЛЯНДАРНЫХ РЫТУАЛАЎ:
## да пытання тэарэтычнага абгрунтавання методык палявых даследаванняў

Этнічная культура беларусаў захавалася менавіта ў іх вясковых асяродках, якія не парушалі ландшафт сваёй жыццядзейнасцю. Цыкл развіцця этнасу па Л. Н. Гумілёву (1) 1500—1200 гг., але ў «персістэнтным» (самадастаткова-закансерваваным) стане ён як біясацыяльны арганізм існуе доўга, калі адмовіўся ад гвалту над прыродай, «упісаў» сябе ў біяхімічны рытм свайго ландшафту. Нашы вясковыя асяродкі да апошняга часу былі традыцыйнымі грамадствамі: лад жыцця якіх (з нагоды сваёй аптымальнасці для біяцэнозу) цалкам абумоўлены перайманнем узораў паводзін, замацаваных у каранёвай культурнай спадчыне (традыцыі продкаў) і таму не падуладных рацыянальнай крытыцы[1]. Аснову жыцця традыцыйных грамадстваў ва ўсім свеце вызначае міфалогія — сістэма этыялагічных тэкстаў — міфаў, што тлумачаць паходжанне з'яў прыроды і культуры: цемры, святла, вады, чалавека, жывёл, земляробства, прылад працы, зла, дабрыні і г. д.[2] «Няпісаныя законы» міфаў не абмяркоўваюць, а бяруць за ўзор для ўсіх у грамадзе[3]. Таму даследчыкі выдзяляюць наступныя функцыі міфалогіі.

Функцыі міфалогіі ў традыцыйным грамадстве

| Магічныя функцыі міфалогіі | | Камунікатыўныя функцыі міфалогіі | |
|---|---|---|---|
| 1) антыэнтрапічная | 2) рэгулятыўная | 3) кансерватыўная | 4) сацыяльная |
| Барацьба з тэндэнцыямі знošвання свету | Падтрыманне належнай раўнавагі ў свеце, прыродным асяродку | Замацаванне пэўных сацыяльных каштоўнасцей | Асвячэнне існуючых інстытутаў улады |

[1] Найважнае ў традыцыі — яе змест: тое што перадаецца ад бацькоў дзецям павінна быць гэтага вартым — забяспечваць іх фізічны і псіхалагічны камфорт, захоўваць біясацыяльную супольнасць — этнас і яго «калыску» — прыродны ландшафт.

[2] Гэтыя тэксты не заўсёды вербальны, часам запісаны на мове сімвалічных дзеяў, музычных і графічных знакаў.

[3] Яны рэгулююць: а) светасузіранне — духоўны свет (як пабудаваны свет і што, зыходзячы з яго будовы, лічыць дрэнным, што — добрым; што — важным, што — нязначным і г.д.); б) сацыяльныя адносіны і грамадскую ідэялогію — паводзіны людзей (якім чынам ставіцца да старэйшых сваякоў, да крэўных, да ворагаў; калі і з кім трэба браць шлюб; калі трэба працаваць, калі — адпачываць; колькі мець маёмасці і ў якім выглядзе і г. д.).

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

Для людзей з міфалагічнай свядомасцю характэрна на першы погляд — дзіцячае, насамрэч — глыбокае і дальнабачнае, трансгістарычнае ўспрыманне сусвету як жывой істоты. У ім трэба падтрымліваць раўнавагу, каб ён «добра працаваў»: дзень змяняўся ноччу, своечасова выспявала насенне, жывыя істоты давалі патомства. З'яўленне дэструктыўных змен у жыццёвых працэсах, міфалагічную «стому» свету навукоўцы характарызуюць як э н т р а п і ю — спыненне ўсіх працэсаў, яго «цеплавую смерць». Небяспека нечага падобнага (у тым ліку і праз драпежныя, характэрныя для урбанізму адносіны да «матчынага» ландшафту) існуе, а генетычная памяць чалавека і міфы захоўваюць інфармацыю пра экакатастрофы і экакрызісы. Таму насамрэч асноўная накіраванасць каляндарных свят — а н т ы э н т р а п і ч н а я м а г і я. У традыцыйнай камунікацыйнай сістэме «чалавек — свет»[4] зносіны між адрасантам (чалавекам) і адрасатам (светам) накіраваны на падтрыманне жыццяздольнасці (рэгуляванне) упарадкаванага свету — к о с м а с у. Як лічыць Мірча Эліядэ, па адчуванні носьбіта традыцыйнай культуры гэта дасягаецца за кошт «прайгравання сцэнару» развіцця касмічнага цыкла (к а с м а л о г і і) у коле гадавых святаў-р ы т у а л а ў — набораў сімвалічных дзеянняў у вызначаным часе і месцы. У фрэймах каляндарных святаў з дапамогай розных семіясістэм[5] чалавек традыцыі рытуальна паведамляе: «Свет нарадзіўся», — потым: «Ён станоўча мяняецца (расце — калькасна павялічваецца)», — пазней: «Ён стаміўся развівацца і дэградуе», — і нарэшце: «Ён знікае (каб нарадзіцца нанова)». Апошняе абумоўлена светаўспрыманнем усіх культур аграрыяў, што папярэднічалі юдзеахрысціянскай. У стараеўрапейскіх культурах і культурах Еўразіі эпохі бронзы час цыклічна «згорнуты ў спіраль»: за смерцю абавязкова крочыць адраджэнне — новае жыццё, якое паўтарае ці мадэлюе мінулае. У такой свядомасці свет сапраўды працуе як запраграмаваная на адвечнасць (адвечны зварот) мадэль — міфапаэтычная мадэль свету. Форма сцвярджэнняў, у якіх носьбіты традыцыі перыядычна «прайграюць сцэнар» сваёй касмалогіі — гэта: аповед міфа з дапамогай узнаўлення фрэйма адпаведнага свята, ці, як яшчэ кажуць, адпраўленне м і ф а р ы т у а л у. Праз каляндар у традыцыйных культурах міфалогія (іх светаўспрыманне) «працуе» на антыэнтрапію, станоўчае рэгуляванне свету.

Гэта кранаецца э з а т э р ы ч н а г а — схаванага сэнсу рытуалаў, цікавага тым, хто займаецца аналізам культуры. Нават калі яго спасціжэнне не становіцца іх рэлігіяй (верай у антыэнтрапічнасць магіі, у звышвызначанасць светапарадку), яны кпяць пра захаванне абрадаў зыходзячы

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

---

[4] «Чалавек – свет» = «чалавек – прырода» = «чалавек – космас».

[5] Не заўсёды жывой вербальнай мовы — каляндарных песень, рытуальных танцаў, гульняў.

ці з іх маральнай, ці з эстэтычнай каштоўнасці для людзей. На Усходзе Еўразіі (Індыя, Тыбет; ці Кітай і Японія да Новага часу) традыцыя стала афіцыйнай рэлігійнай і ідэялагічнай дактрынай грамадства[6]. На Захадзе яна захавалася на вёсцы і ўзважыць глыбінны сэнс нашай каранёвай культуры (з якой мы кантактуем не ва ўзнёсла-паэтычных, а ў празаічных абставінах) здольны не кожны. Эзатэрычныя веды — патрэба выбраных — людзей, якія няспынна імкнуцца да самаўдасканалення. Таму цікава, што ў палескіх суполках выканаўцаў карагодаў «Страла» бытуе дакладнае разуменне антыэнтрапічнай накіраванасці мясцовых абрадаў. Яны ўпэўнены, што супольнае іх выкананне (вернасць «старынушке») — паратунак свету ад дэструкцыі; і, больш таго, сусветны парадак гарантуе сацыяльны: калі свет упарадкаваны, людзі прыязна ставяцца адно да аднаго; магчымы сяброўства і ўзаемадапамога. Знікненне традыцыйнай абраднасці (для ніх — неадпраўленне «Стралы» — сімвалу традыцыі) — сімптом дэструкцыі свету. Гэткая «касмалагічная» інтэрпрэтацыя «Стралы» была выказана спантанна, па ініцыятыве саміх носьбітаў традыцыі (Зуевай М. Л., з в. Стаўбун Веткаўскага раёна) пры правядзенні палявых даследаванняў па этнафоназнаўству спецыялістамі БДУКіМ на «Страле» 2004 г. Гэта — прыклад таго, як мала мы ўяўляем светаўспрыманне свайго этнасу; і нагода перагледзець методыкі палявых даследаванняў, паколькі такі погляд на сусвет — прыклад разумення мінімум непадзельнасці біялагічнага і сацыяльнага ў этнасе (як часткі прыроды, свету), характэрнага для адчуваючых складаную эзатэрычную аснову каляндарных рытуалаў.

Большасць ж людзей задавальняе э к з а т э р ы ч н ы — знешні — іх бок: гульні, мастацкія праявы, сямейныя і супольныя звычаі. Яны імі карыстаюцца, спалучаючы захапленне міжасабовай камунікацыяй у іх час з разнастайнымі забабонамі і прымхамі. Паколькі ў кансерватыўных і сацыяльных праявах праз рытуалы традыцыя асвячае сям'ю, павагу да старэйшых, узаемадапамогу, праўдзівасць і мараль, у міфах абавязкова тлумачыцца і грамадскі парадак, этыкет, нормы паўсядзённых паводзін, але «на праверку» праз semiятычны аналіз заўважна, што экзатэрычныя бакі традыцыі насамрэч знітаваны з антыэнтрапічнай касмалогіяй[7], як бачна з прыкладу са «Стралой».

[6] Як лічыў філосаф-традыцыяналіст Р. Генон — гэтым сталі яе рэшткі: экзатэрычная традыцыя (нават у форме рэлігіі) — толькі спроба захаваць нязменнай форму адкравення (сумы зверхчалавечых ведаў — традыцыі), калі змест захаваць ужо немагчыма.

[7] У традыцыйнай свядомасці сацыяльны парадак знітаваны з энтрапіяй: кожны дрэнны ўчынак, напрыклад, для парсаў – індаіранцаў-зараастрыйцаў, суполкі якіх існуюць дагэтуль – падтрымка сіл цемры, набліжэння гібелі ўсяго жывога ў апісаным у іх эсхаталагічных міфах апошнім полымі светазнікнення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тыя ж, чыё крэда: «Неістотна ўсё, што нельга выпіць і з'ясі», — адмаўляюць і эзатэрычным пабудовам аналітыкаў, і рытуалам у праве на існаванне. Яны ўпэўнены: чалавек жыве выключна дзеля таго, каб задавальняць свае першасныя патрэбы — у ежы, у даху над галавой, у партнёры; і калі для гэтага традыцыі не патрэбны — у іх няма сэнсу. Гісторыя, аднак, недвухсэнсоўна сведчыць: пры знікненні традыцый і культурных сувязей у грамадстве непазбежна нікнуць і ежа, і дах, і сям'я. Найбліскуча гэта апісаў Гумілёў у этналагічным бэстселеры «Этнагенез і біясфера Зямлі». Сёння народная культура вывучаецца і ахоўваецца на дзяржаўным узроўні. Апошняе — сведчанне таго, што кансерватыўная і сацыяльная функцыі традыцыі, этнічнай культуры ўсё яшчэ актуальны і нявычарпаны, ва ўсякім разе, пакуль мы не спадобіліся незваротна сапсаваць прыродны ландшафт, які змяшчае нашу біясацыяльную цэласнасць, супольнасць — беларускі этнас.

Літаратура

[1] Гумилёв Л. Н. Этногенез и биосфера Земли. М.: АСТ, 2001.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ